**Тэма:** Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікам
**Мэта:** навучыць ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў назоўным склоне; фарміраваць уменне асэнсавана ўжываць простыя сказы ў маўленні;спрыяць выхаванню пачуцця любові да Радзімы, грамадскай адказнасці, гонару за сваіх землякоў.
Абсталяванне: падручнік 5 класа, прэзентацыя

## I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

**1. Стварэнне эмацыянальнага настрою**

--Добры дзень! Вітаю вас усіх.

**Прытча пра дзве сахі.**

У аднаго селяніна былі дзве сахі. Абедзве яны былі аднолькавыя. Але адну саху селянін браў з сабою ў поле, а другая заставалася стаяць у куточку. Саха, якая выкарыстоўвалася ў працы, была прыгожай, бліскучай. Другая ж пачынала іржавець. Аднаго разу сяброўкі сустрэліся.

– Скажы, чаму ты такая прыгожая? – спытала першая. - А я ўвесь час прастаяла ў куточку, і паглядзі, што са мной сталася.

– Гэта безрабоцце цябе згубіла, – адказала ёй сяброўка.

- Скажыце, чаму адна саха была прыгожай, бліскучай, а другая пачынала іржавець?
(Выснова: праца робіць чалавека прыгажэйшым. Дзякуючы працы, чалавек узбагачаецца і духоўна і матэрыяльна).

- Я жадаю вам працаваць сумленна і ўзбагаціць свае веды. Трывалыя веды вам спатрэбяцца не толькі на сённяшнім уроку, але і ў вашым самастойным жыцці.

Вы заўважылі, што на дошцы **<u>замацаваны ?</u>** За ім хаваецца цікавае заданне. Гэты пытальнік я змагу адкрыць у канцы ўрока толькі пры ўмове, што ўсе запланаваныя заданні будуць разгледжаны.

**2.** **Праверка д/з** адбывалася да пачатку ўрока. ( прыём “пісьмо даверу”: кансультанты тлумачаць, хто выканаўд/з, хто не і па якой прычыне) (у гэты час 2 вучні працуюць каля дошкі)

**3.** Лінгвістычная размінка ў выглядзе **гульні “Ты мне – я табе”**, выкарыстоўваючы “тоўстыя” і “тонкія” пытанні.

**4.** Праверка выкананых заданняў на дошцы.

**5.** **Зварот да эпіграфа**

Скажыце, калі ласка, у якой краіне мы жывём?(Беларусь). Гэта наша Радзіма.
– Падбярыце сінонімы і блізказначныя словы да слова “радзіма”. (Магчымыя адказы: бацькаўшчына, айчына, родны край, свой край, наш край, родная краіна, свая краіна.)

– Якія асацыяцыі ўзнікаюць у вас, калі гучыць слова “радзіма”?

Ці супадаюць вашы думкі з думкамі К.Кірыенкі, словы якога я ўзяла за эпіграф на сённяшні ўрок.

**Радзіма – гэта і сонца ў цябе над галавой, і паветра, якім дыхаеш, гэта і вернасць твайго сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня, што засталася ад прадзедаў. (К.Кірыенка)**

– Калі спытаць, ці любіце вы сваю радзіму, то, безумоўна, адкажаце: "Так!". Растлумачце паняцці "вялікая радзіма" (Радзіма) і "малая радзіма"(радзіма). Як называецца наша "вялікая радзіма"? (Беларусь). А "малая радзіма"? ( Старадарожчына, Старыя Дарогі).

- Як вы думаеце, чаму я ўзяла менавіта эпіграф пра Радзіму? ( Урок будзе тэматычным. На працягу ўрока мы будзем звяртацца да тэмы "Радзіма") Можа, хто з вас вызначыць граматычную аснову ў гэтым складаным сказе?

**6. Запіс даты і тэмы ўрока. Вызначэнне задач урока**

## II. Інфармацыйна-пошукавы этап

- Як вы разумееце значэнне запісанай прыказкі?

  **Радзіма — матка, чужына — мачыха** (прыказка)

**Старадарожчына - святая беларуская зямля, мілая і дарагая сэрцу мясціна.**

- Вызначце граматычныя асновы гэтых сказаў. Чым выражаны дзейнік, выказнік? Зрабіце вывад пра пастаноўку працяжніка. Прачытайце правіла на с. 88.

- Практ.149 (чытанне, вызначэнне дзейніка і выказніка, тлумачынне працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам)
  - Выпісаць толькі сказы на тэму "Радзіма" ( 4,5)
- Прыдумайце свае сказы на гэту тэму.(лепшыя з іх запісваюцца на дошцы)

(Мая Радзіма – Беларусь. Беларусь – самая мірная ў свеце краіна. Старыя Дарогі – прыгожы горад. Радзіма – гэта вочы матулі, яе ўсмешка, яе цёплая далонь на вашай дзіцячай галаве, гэта вашы родныя, ваш дом.)

## III. Фізкультхвілінка

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

## IV. Трэніровачна –карэкцыйны этап

- **Практ.151** ( на дошцы: замяніць сказы блізкімі па сэнсе)
- **Практ. 150 (**сам. работа: выпісаць сказы**)**
- **Практ. 152 (пералад)**

- Пра што ідзе гутарка ў тэксце? (пра творы мастацтва). Гаворачы сёння пра радзіму вялікую і малую, нельга не ўспомніць пра легендарную асобу Старадарожчыны. Гэта беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў РБ, прафесар Беларускай Акадэміі мастацтва. А нарадзіўся ў в. Мядзведня. Хто гэта?( **Іван Нічыпаравіч Стасевіч** 1929-1998) . Што вы ведаеце пра яго?

- Наш зямляк абараняў не толькі сваю Радзіму (у гады Вялікай Айчыннай вайны дайшоў да Берліна, нават распісаўся на сценах Рэйстага), але і праславіў свой родны куток Беларусі – Старадарожчыну. Ён пісаў сюжэтна-тэматычныя карціны, пейзажы, партрэты, звяртаўся да жывапісу. Больш за 20 карцін знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальнай мастацкай галерэі Беларусі. Больш за 100 карцін – у раённым краязнаўчым музеі, і 13 работ знаходзіцца ў школьным музеі вёскі Горкі, дзе ён вучыўся. Яго карціны знаходзяцца і за мяжой: у Алжыры, Англіі, Аўстрыі, ЗША, Германіі, Балгарыі і інш. краінах.

- Як можна назваць чалавека, які шчыра адданы сваёй працы, горача любіць сваю Радзіму і праслаўляе яе? (<u>патрыёт)</u> Кожны чалавек павінен ганарыцца той мясцінай, дзе нарадзіўся і жыве, любіць свой родны куточак (малую радзіму) як часцінку нашай Бацькаўшчыны.

- **Пераклад тэксту**: ( запіс 1 сказа на дошцы, вызначэнне граматычнай асновы у сказе, тлумачэнне -)

Жывапіс – вельмі старажытнае мастацтва. Выдзяляюць розныя віды жывапісу. Карціны прыроды – гэта пейзаж. Выявы людзей – партрэт, выявы рэчаў і пладоў – нацюрморт. Жывапіс кожнай краіны звязаны з яе гісторыяй.

Рэпрадукцыі – гэта копіі твораў мастацтва.

- Гульня “Падбяры сваякоў” з…мля, м..сціна, …

Ці падыходзіць сюды слова, змешчанае ў рамцы на с.89? ( яго трэба запомніць)

## V. Кантрольна-рэфлексійны этап

- Лічбавы дыктант. Ставім толькі № таго сказа, у якім ставіцца працяжнік. <u>Адказы: 1,3,4,6,9,11.</u>

1. Беларусь — край легенд, казак і паданняў.
2. Родная зямля мякчэй чужой пярыны.
3. Мінск-сталіца – усяму свету святліца.

4. Возера Скачальскае – любімае месца старадаражан.
5. Беларус адрозніваецца шчодрасцю, гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе.
6. Іван Стасевіч – наш гонар і слава.
7. На родным полі расце лепшая доля.
8. Для сваёй Айчыны не шкадуюць сілы.
9. Свая зямля – вось што аснова.
10. На чужой старане не сагрэе і сонца.
11. Чужая старана—цёмны лес.

- Заданне з ? Задача-загадка

22 чалавекі забіць мяне хочуць; як заб’юць, 11 радуюцца, 11 сумуюць, а я жывы застаюся.(Дзве футбольныя каманды і мяч)

- Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

- Рэфлексія. Прыём “Аргументацыі”:

1. На ўроку я працавала…, таму што… .
2. Сваёй работай на ўроку я… .
3. Урок мне спадабаўся… .
4. За ўрок я… .
5. Мой настрой… .
6. Матэрыял урока мне быў…

Я завяршаю наш урок з добрым настроем, бо сёння наша праца была спакойнай, дружнай і стваральнай. Я ж разам з паэтам А.Грачанікавым жадаю:

Каб вы заўжды, з малых гадоў
Шчаслівымі былі.
Расцілі шчырую любоў
Да роднае зямлі.
Хай будзе светлы ваш узлёт
Да новых спраў, сябры!
Няхай прыносіць вам жыццё
Найлепшыя дары.

**VI. Дамашняе заданне**

Практыкаванне 153

Гэтыя пранікнёныя радкі — выражэнне любові да роднага краю, бацькоўскай зямлі,
Прырода Беларусі вельмі прыгожая.
Мая Беларусь - Еўрапейская дзяржава
Мінск – сталіца – усяму свету святліца.

Свая хатка – родная матка, а чужая – мачыха"